ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 СТУДЗЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 3 (28367)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хто ў школе ідэал?**



**Мільён руж сярод зімы**



**«Мама, я тату́ хачу!»**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валянцін МІХНЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў:**

*«Беларускія праваахоўныя органы ўдасканальваюць метады работы з улікам новых выклікаў. Мы павышаем узровень баявой падрыхтоўкі, мадэрнізуем усе свае тэхнічныя сродкі, што спрыяе і павышэнню ўзроўню абараназдольнасці, і гарантаванню грамадскай бяспекі. Нарматыўная прававая база краіны таксама дазваляе аператыўна рэагаваць на ўсе выклікі і пагрозы сучаснасці. Нашы праваахоўнікі працуюць над тым, каб быў эфектыўны інструментарый для процідзеяння, папярэджання, прафілактыкі злачынстваў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9707 | ▲ |
| Еўра | 2,0534 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0322 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0733 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# СВЯТА ДОБРАГА ХАКЕЯ

**Учора ў Мінску на лёдзе «Чыжоўка-Арэны» стартаваў XIII Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сёлета ён сабраў рэкордную колькасць краін-удзельнікаў — пазмагацца за галоўны прыз прыехалі прадстаўнікі пятнаццаці дзяржаў.**

Адкрываючы хакейнае свята, Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што гледачоў і балельшчыкаў «чакаюць займальныя і яркія баталіі на лядовых арэнах. Зноў тварам да твару сыдуцца каманды, якія гатовыя ўпарта змагацца за галоўны прыз, паказаць гледачам высокі клас гульні». «Да нас прыехалі пераможцы і прызёры чэмпіянатаў свету, Алімпійскіх гульняў, хакеісты, якія выступалі ў НХЛ», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што хакей карыстаецца асаблівай любоўю і ўвагай беларусаў. «Нашы гледачы змогуць па вартасці ацаніць дакладны кідок, галявы пас, самаадданую гульню варатара, філігранную тэхніку нападаючага і зладжанасць дзеянняў кожнай з каманд. Госці сталіцы пераканаюцца ў традыцыйнай гасціннасці беларускага народа, змогуць пазнаёміцца з Беларуссю, яе гісторыяй і культурай, здабыць новыя цікавыя кантакты. Бо спорт — гэта найлепшая форма народнай дыпламатыі», — лічыць беларускі лідар.

Ужо ў першы дзень турніру прайшлі паядынкі паміж зборнымі Германіі і Фінляндыі, Балкан і Швейцарыі, Славакіі і Расіі. Пасля цырымоніі адкрыцця адбыўся матч паміж зборнымі Беларусі і ААЭ, які скончыўся, калі нумар ужо быў падпісаны. За зборную нашай краіны гуляў і Прэзідэнт.

Турнір прадоўжыцца да 7 студзеня. Па традыцыі ўваход на гульні бясплатны, а каля «Чыжоўка-Арэны» арганізаваныя святочныя гулянні.



Фота БЕЛТА.

Турнір стартаваў матчам Фінляндыя — Германія (11:3).

# СНЕЖНАЯ ФІЗКУЛЬТУРА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора пасля снегападу вучні сталічнай школы №30 разам з настаўнікам фізкультуры Леанідам МАШАЎЦОМ выйшлі чысціць школьны стадыён, каб потым – з маразамі — заліць на ім каток.

■ «Звязда» даследуе праблему

# АВАРЫЙНЫЯ БУДЫНКІ ЦІ ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА?

## Ці ўдасца знайсці залатую сярэдзіну ў спрэчках аб лёсе нізкапавярховых забудоў у цэнтры сталіцы?

**Тыя, хто не быў у нашай сталіцы некалькі дзесяцігоддзяў, а нават і гадоў, прыкмячаюць, што аблічча Мінска імкліва мяняецца. З'яўляюцца новыя ўражальныя будынкі і цэлыя раёны. Пры гэтым зберагчы непаўторны дух «старога Менска» атрымліваецца далёка не заўсёды. Летась спрэчкі аб захаванні будынкаў і насаджэнняў разгарэліся ў некаторых старых раёнах сталіцы асабліва эмацыянальна. Сучасныя «бітвы» за Асмалоўку і Сельгаспасёлак сталі тэмай для актыўнага абмеркавання ў сецяве і падстаў для зваротаў у розныя інстанцыі. Што ж там адбываецца насамрэч?**

### Новая транспартная магістраль або душэўная Асмалоўка?

Раён у межах цяперашніх вуліц Кісялёва, Куйбышава, Камуністычнай і Багдановіча быў пабудаваны ў першыя пасляваенныя гады. Сваю назву ён атрымаў у гонар архітэктара Міхаіла Асмалоўскага, які займаўся распрацоўкай праекта. Узводзілі двухпавярховыя домікі палонныя немцы і італьянцы.

Ужо ў тыя гады архітэктара крытыкавалі за тое, што ён пабудаваў «вёску» ў цэнтры Мінска. Аднак сімпатычныя дамы, з густам аздобленыя элементамі дэкору ў еўрапейскай стылістыцы, хутка стварылі раёну славу элітнага. Гэта меркаванне толькі ўмацавалася ў 1950-я гады, калі Асмалоўку абнеслі мураванай агароджай, якая нават закрывалася на ноч: уваход ажыццяўляўся толькі па прапусках ці запрашэнні гаспадароў.

Публіка жыла тут адпаведная статусу «вяршкоў» грамадства: афіцэры, супрацоўнікі міністэрстваў, прафесары. Праз некаторы час абсталявалася тут і творчая эліта — артысты Вялікага тэатра оперы і балета, мастакі. Дарэчы, славу «багемнага» раён захаваў за сабой да гэтага часу. На невялікай тэрыторыі знаходзіцца восем мастацкіх майстэрняў.

СТАР. 4